[17] Гл.: Запись заседания глав правительств. 07.02.1945 // Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны. 1941-1945. Т. 4. Крымская конференция руководителей трех союзных держав - СССР, США и Великобритании. 4-11 февраля 1945 г. М., 1984. С. 117.

[18] Гл.: Запись шестого заседания глав правительств. 22.07.1945 // Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны. 1941-1945. Т. 6. Берлинская (Потсдамская) конференция руководителей трех союзных держав - СССР, США и Великобритании. 17 июля - 2 августа 1945 г. М., 1984. С. 125.

[19] Гл.: Проект предложения о перемещении германского населения, согласованный в комиссии 30 июля 1945 // Там жа. С. 400.

Пастуміў у рэдакцыю 18 02 05

***Сяргей Аляксандравіч Лукашанец*** - аспірант кафедры гісторыі заходніх і паўднёвых славян. Навуковы кіраўнік - кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.П. Салькоў.

*Г.П. БУШЧЫК*

# ЭКАНАМІЧНЫЯ СУВЯЗІ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД АДНАЎЛЕННЯ ГАСПАДАРКІ ПАСЛЯ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ: НОВЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ

Обобщены новые исследования белорусских ученых, посвященные внешним источникам восстановления экономики Беларуси после Великой Отечественной войны. Характеризуется значение германских репарационных поставок, труда военнопленных, помощи ООН.

The article under consideration generalizes the investigation of Belarusian scientists, dedicated to external sources of renovation of the Belarusian economy after World War II. The role of German reparation deliveries, work of prisoners of war, UNO assistance are characterized.

Святкуючы юбілей Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне над фашысцкай Германіяй, мы адзначаем і выдатныя дасягненні Беларусі ў пасляваенным аднаўленні эканомікі, найперш у пабудове передавога па тым часе прамысловага комплексу, стварэнні новых галін вытворчасці.

У гады вайны Беларусь пацярпела больш з усіх саюзных рэспублік, яна страціла, па пасляваенных падліках, 2 млн 200 тыс. чалавек насельніцтва (апошнім часам называецца лічба 3 млн), па стану эканомікі была адкінута да 1928 г. За пяць пасляваенных гадоў БССР не толькі дасягнула даваеннага ўзроўню выпуску прамысловай прадукцыі, але і перавысіла яго на 15 %. Узровень 1945 г. у 1950 г. быў перавышаны ў 5,8 раза. У 1955 г., калі ў лік дзеючых уступілі ўсе аднoўленыя і ўпершыню пабудаваныя прадпрыемствы, узровень 1945 г. у прамысловасці Беларусі быў перавышаны амаль у 12 разоў, а ўзровень 1940 г. - у 2,4 раза (падлічана аўтарам)[1]. Такіх тэмпаў развіцця прамысловасць Беларусі не ведала ў папярэдняй гісторыі. Адбывалася не проста механічнае пашырэнне традыцыйнай вытворчасці - назіраліся якасныя змены ў яе структуры. Машынабудаванне стала вядучай галіной беларускай прамысловасці, пашыралася ваенная вытворчасць.

Марудней аднаўлялася лёгкая і харчовая прамысловасці. Сельская гаспадарка перавысіла даваенны ўзровень вытворчасці толькі ў сярэдзіне 1950-х гг. Адставаў ад развіцця індустрыі і матэрыяльны дабрабыт насельніцтва.

У беларускай гістарычнай літаратуры перыяду пасляваеннага аднаўлення гаспадаркі прысвечана шмат даследаванняў. Ён справядліва названы гераічным, як і перыяд антыфашысцкай барацьбы. Гісторыкі адзначалі працоўны гераізм беларускага народа, братнюю дапамогу рэспублік усяго Савецкага Саюза як асноўныя фактары поспехаў у аднаўленчым перыядзе. Па меры вызвалення беларускіх тэрыторый, ужо ў 1944-1945 гг., Расійская Федэрацыя, Украіна, Грузія, Азербайджан, Казахстан, Чувашская, Удмуртская ССР і іншыя рэспублікі прысылалі ў разбураную вайною Беларусь абсталяванне, транспартныя сродкі, метал, каменны вугаль, нафтапрадукты, будаўнічыя матэрыялы, жывёлу, спажывецкія тавары[2]. Да таго ж на аднаўленне гаспадаркі Беларусі яшчэ да 1946 г. савецкі ўрад выдзеліў 1 тыс. станкоў, 1542 трактары, 2 тыс. т метала, каля 100 тыс. куб. м лесу, 20 тыс. кв. м шкла і інш. Урад СССР накіраваў у Беларусь на некалькі мільёнаў рублёў тканін, абутку, трыкатажных вырабаў у якасці дапамогі найбольш пацярпелай рэспубліцы[3]. Уласнымі даходамі бюджэт Беларусі

забяспечваў менш за палову патрэб па фінансаванню аднаўлення і развіцця гаспадаркі. Пабудова і аснашчэнне найбуйнейшых прамысловых аб'ектаў поўнасцю фінансаваліся з саюзнага бюджэту[4].

Разам з тым у гістарычных даследаваннях савецкага перыяду адсутнічала нават упамінанне аб выкарыстанні германскіх рэпарацыйных* паставак для аднаўлення гаспадаркі Беларусі, аб працы ваеннапалонных і інтэрніраваных на аб'ектах народнай гаспадаркі рэспублікі, аб дапамозе Беларусі пасля вайны з боку ААН. Пры асвятленні працэсу пасляваеннага аднаўлення гаспадаркі і наладжвання мірнага жыцця насельніцтва пастаянна падкрэслівалася, што ён адбываўся выключна за кошт уласных сіл і сродкаў. Акрамя таго, дакументы, што датычылі замежных сувязяў у справе аднаўлення гаспадаркі і мірнага жыцця насельніцтва, да пачатку 1990-х гг. былі засакрэчанымі.

Асноўнымі прычынамі замоўчвання выкарыстання замежных крыніц пасляваеннага аднаўлення, якія, канешне, адыгрывалі не галоўную, а дапаможную ролю, былі, на наш погляд, найперш ідэалагічныя, а таксама псіхалагічныя. Пасля таго, што зрабілі гітлераўцы на акупіраваных беларускіх землях і з улікам нянавісці да іх беларускага насельніцтва, для савецкага кіраўніцтва непрымальным было публічнае прызнанне ролі рэпарацыйных паставак, працы ваеннапалонных і інтэрніраваных у пасляваенным аднаўленні гаспадаркі Беларусі. Таксама, магчыма, савецкія ўлады не хацелі азмрочваць непрыемнымі ўспамінамі адносіны з некаторымі сацыялістычнымі краінамі, былое кіраўніцтва якіх ваявала на баку Гітлера і з якіх таксама браліся рэпарацыі, ваеннапалонныя з якіх працавалі на аб'ектах народнай гаспадаркі.

Логіка "халоднай вайны", якая пачалася ў 1946 г. паміж СССР і былымі саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі, перашкаджала станоўча адзывацца аб дапамозе ААН, якая ў асноўным ішла ў БССР з ЗША.

У наш час, калі ў архівах былі рассакрэчаны дакументы адносна паступлення ў БССР рэпарацый, працы ваеннапалонных, дапамогі ААН, гісторыкі атрымалі магчымасць больш аб'ектыўна і дакладна прааналізаваць крыніцы аднаўлення гаспадаркі Беларусі пасля вайны, вызначыць істотныя фактары гэтага працэсу, якія раней не называліся. Уведзеныя ў навуковы абарот новыя дакументы сведчаць, што пэўны ўклад у пераадоленне пасляваеннай разрухі ў Беларусі ўнеслі разам з беларускім народам, рэспублікамі СССР і некаторыя іншыя краіны свету. Адны гэта рабілі добраахвотна і самаахвярна, як краіны, што ўваходзілі ў склад ААН. Другія, як Германія і яе былыя саюзнікі, - прымусова, у якасці кампенсацыі за нанесены ў вайну ўрон і ў адпаведнасці з міжнароднымі пагадненнямі.

Аб германскіх рэпарацыях у беларускай гістарычнай літаратуры сталі пісаць толькі ў другой палове 1990-х - пачатку 2000-х гг. Так, У. Снапкоўскі паказаў працэс прад'яўлення рэпарацыйных прэтэнзій Германіі з боку Беларусі, абазначыў агульную суму рэпарацый, на якую прэтэндавала БССР[5]. А. Шаркоў даследаваў працу ў Беларусі ваеннапалонных і інтэрніраваных (прымусова мабілізаваных на тэрыторыі дзяржаў - былых саюзнікаў Германіі для аднаўленчых работ у пацярпелых краінах), якая прадугледжвалася пагадненнямі аб рэпарацыях[6]. Аўтар гэтага артыкула прысвяціла шэраг публікацый ролі германскіх рэпарацый у аднаўленні Мінска, Магілёва, эканомікі Беларусі ў цэлым[7]. Аднак па-ранейшаму многія аспекты праблемы выкарыстання рэпарацый, вызначэння іх аб'ёмаў, ролі ў аднаўленні гаспадаркі Беларусі пасля вайны патрабуюць далейшага вывучэння.

Рэпарацыі, якія атрымала БССР з Германіі, былі цалкам справядлівай і частковай кампенсацыяй за тыя страты, што панесла Беларусь у гады Другой сусветнай вайны. Па падліках спецыяльна створанай дзяржаўнай камісіі, матэрыяльныя страты Беларусі ў вайне былі ацэнены ў 15 млрд дол. ЗША, альбо 75 млрд р.[8] Для параўнання: страты СССР у цэлым вызначаліся ў суме 128 млрд дол., Францыі - 30 млрд, Галандыі - 10 млрд, Грэцыі - 3 млрд. У цэлым жа 17 краін, пацярпелых ад агрэсіі ў Другой сусветнай вайне, прад'явілі Германіі рахунак за

Тэрмін рэпарацыі (ад лат. reparatio - аднаўленне) стаў шырока выкарыстоўвацца ў міжнародна-прававой практыцы з часоў Першай сусветнай вайны, ён абазначае матэрыяльную адказнасць агрэсара за страты, нанесеныя ахвярам агрэсіі.

ўрон больш чым на 200 млрд дол., што значна перавышала ўсё нацыянальнае багацце Германіі, таму ўдзельнікі антыгітлераўскай кааліцыі дамовіліся аб змяншэнні сваіх прэтэнзій у 10 разоў і спагнанні з Германіі 20 млрд дол., з якіх 10 млрд прадугледжвалася для СССР, з долі якога выдзяляліся сродкі на аднаўленне Польшчы[9]. БССР згадзілася на 1,5 млрд дол. рэпарацыйных кампенсацый[10].

У адпаведнасці з рашэннямі саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі на Ялцінскай і Патсдамскай канферэнцыях 1945 г., рэпарацыі ізымаліся ў трох формах: прамысловага абсталявання, таварных паставак прадукцыі, працы ваеннапалонных і інтэрніраваных[11]. Рэпарацыі павінна была выплаціць не толькі Германія, але і яе саюзнікі. СССР палучаў рэпарацыйныя пастаўкі яшчэ да завяршэння вайны (яны спачатку называліся трафейнымі) і атрымліваў іх да пачатку 1954 г.[12] Што датычыць БССР, то ў Нацыянальным архіве РБ аўтарам выяўлены дакументы адносна матэрыяльных паставак рэпарацый з Германіі. Калі рэпарацыі і паступалі ў Беларусь ад былых саюзнікаў Германіі ў вайне, то відавочна ў невялікай колькасці. У архіўных дакументах адлюстраваны масавыя пастаўкі рэпарацый у 1945-1947 гг., пазней яны паступалі ў Беларусь у значна меншых аб'ёмах.

Апошнім часам можна пачуць выказванні аб састарэласці і непрыгоднасці таго абсталявання, што паступала ў Беларусь з Германіі. З гэтым нельга пагадзіцца. З мэтай дэмілітарызацыі Германіі ў першую чаргу з яе тэрыторыі поўнасцю вывозілі абсталяванне ваенных прадпрыемстваў, якое было перадавым па сваім часе і дазваляла Германіі перамагаць іншыя краіны на пачатку вайны. Грамадзянскія прадпрыемствы звычайна дэмантаваліся часткова, каб яны маглі забяспечваць жыццё насельніцтва пасляваеннай Германіі, а таксама пастаўку прадукцыі ў кошт рэпарацый. Безумоўна, сярод рэпарацыйных паставак было як навейшае абсталяванне, так і пашкоджаныя, некамплектныя, часам састарэлыя станкі, але гэта нельга сцвярджаць аб рэпарацыйным абсталяванні ў цэлым.

Рэпарацыі паступалі ў БССР найперш у выглядзе прамысловага абсталявання, транспартных сродкаў, сыравіны і паўфабрыкатаў для вытворчасці, гатовай прадукцыі, а таксама спажывецкіх тавараў, харчовых прадуктаў, жывёлы і г. д. Іх атрымлівалі практычна ўсе прадпрыемствы, якія аднаўляліся альбо нанова будаваліся, саўгасы і калгасы, грамадзяне. Напрыклад, у 1946 г. абсталяванне з Германіі атрымалі 15 электрастанцый (у Гомелі, Гродне, Віцебску, Бабруйску, Мазыры, Баранавічах, Лідзе і інш.), 13 малочных заводаў (у Мінску, Гомелі, Слуцку, Полацку, Быхаве, Пінску, Скідзелі і інш.), чатыры мясакамбінаты (у Гомелі, Гродне, Баранавічах, Глыбокім). Да пачатку 1947 г. 150 мінскіх прадпрыемстваў і арганізацый атрымалі 5666 вагонаў з абсталяваннем на суму 115 млн р., у тым ліку Мінскі аўтазавод - каля тысячы вагонаў на суму амаль 20 млн р. Усяго ў 1945-1946 гг. прадпрыемствы і арганізацыі Беларусі атрымалі 37,4 тыс. вагонаў рэпарацыйных паставак з Германіі, сваім ходам за гэты час прыгналі ў Беларусь 130 430 коней, 137 847 галоў буйной рагатай жывёлы[13].

Усю рэпарацыйную маёмасць атрымальнікам неабходна было ацэньваць з удзелам прадстаўнікоў фінансавых органаў, сродкі за яе трэба было пералічваць у саюзны бюджэт (для прадпрыемстваў за кошт выдзеленых фінансаў і дзяржаўных крэдытаў). Спажывецкія тавары і харчовыя прадукты прадаваліся праз магазіны. Разлічыцца за жывёлу і інвентар павінны былі калгасы і аднаасобнікі. Рэпарацыі без аплаты атрымлівалі культурна-асветніцкія ўстановы, тыя прадпрыемствы і ўстановы, якія маглі даказаць, што вернутая маёмасць належала ім да вайны, як, напрыклад, Гродзенская тытунёвая фабрыка, дзяржава дапамагала таксама інвалідам вайны і сем'ям загінуўшых. У выніку атрымлівалася, што поўнасцю кампенсацыйны характар рэпарацыі мелі для дзяржавы ўвогуле і часткі найбольш пацярпелых ад вайны грамадзян, усім астатнім за рэпарацыі трэба было заплаціць. Напрыклад, рэпарацыйныя коні каштавалі ад 150 р. за жарабя да 2600 р. за цяжкатранспартных коней у добрым стане. Калгасам дазвалялі выплату трох кілаграмаў зерня альбо іншых прадуктаў у вызначаных эквівалентах за кожны кілаграм жывой вагі буйной рагатай жывёлы. Племянны маладняк птушкі каштаваў: цыпляня - тры, вуцяня - пяць, гусяня - сем рублёў. Цэны на грузавыя аўтамашыны ваганіся ад сямі да 17 тыс. р. Цукар каштаваў

1 р. 20 кап. за кілаграм і г. д.[14] Пры гэтым на рынках Беларусі 1 кг жытняй мукі ў 1947 г. каштаваў 25-48 р., 1 кг ялавічыны - 35-40 р., 1 кг сала - 130-160 р.[15]

У пасляваенны перыяд на будоўлях Беларусі шырока выкарыстоўвалася праца ваеннапалонных і інтэрніраваных. А. Шаркоў адзначае, што ў аднаўленні гаспадаркі Беларусі ўдзельнічалі ваеннапалонныя з Германіі, Венгрыі, Аўстрыі, Румыніі і іншых краін. Акрамя таго, прымусова напраўляліся на працу ў Беларусь з Германіі інтэрніраваныя - мужчыны працаздольнага ўзросту. У 1946 г. на Беларусі працавала найбольшая колькасць ваеннапалонных і інтэрніраваных - каля 103 тыс. чалавек[16]. У 1947 г. толькі ў Мінску на будаўніцтве і аднаўленні розных аб'ектаў працавалі каля 25 тыс. ваеннапалонных, у тым ліку найбольш на будаўніцтве трактарнага завода - 4500, аўтамабільнага - 3700, у трэсце № 2 Упраўлення па аднаўленню Мінска - 3600, на аднаўленні тэатра оперы і балета - 1350, Акадэміі навук - 800. На аднаўленні "Гомсельмаша" працавалі 800 ваеннапалонных, у Магілёўскім аблбудтрэсце - 1300 і г. д.[17]

Выкарыстанне падчас аднаўлення эканомікі БССР libraryраўнальна высокатэхналагічнага нямецкага абсталявання, у тым ліку з многіх ваенных аб'ектаў Германіі, спрыяла пераўтварэнню Беларусі ў пасляваенныя гады ў адзін з найбольш прамыслова развітых рэгіёнаў СССР, а з часам у так званы "зборачны цэх" Саюза. Прамысловая стратэгія СССР у перыяд аднаўлення гаспадаркі была накіравана на стварэнне ў Беларускай рэспубліцы вытворчасці, якая б задавальняла ў асобных відах прадукцыі патрэбы ўсяго Савецкага Саюза, а пазней і многіх сацыялістычных краін. Імкпівае развіццё індустрыі спрыяла павышэнню жыццёвага ўзроўню, развіццю адукацыі, навукі, павышэнню кваліфікацыі кадраў.

Калі рэпарацыі былі прымусовай формай адказнасці агрэсара за прычыненыя страты Беларусі, то дапамога ААН, прадастаўленая БССР у 1946-1947 гг., стала шчырай і добраахвотнай падтрымкай саюзнікаў у вайне, якую несправядліва замоўчвалі і пра якую нават не пісалі ў газетах, калі яна паступала. У. Снапкоўскі прааналізаваў дапамогу Беларусі з боку ААН па лініі ЮНРРА (англійская абрэвіятура назвы - Арганізацыя дапамогі і аднаўлення Аб'яднаных Нацый). ЮНРРА была створана ў лістападзе 1943 г. удзельнікамі антыгітлераўскай кааліцыі, у тым ліку і СССР, з мэтай дапамогі краінам, найбольш пацярпелым ад акупацыі. Пастаўкі харчавання, вопраткі, медыкаментаў, насення, сельскагаспадарчага і прамысловага абсталявання былі бясплатнымі і ў асноўным ажыццяўляліся тымі краінамі, якія не пацярпелі ад акупацыі, - ЗША, Канадай, Аўстраліяй, лацінаамерыканскімі дзяржавамі. Памер узносаў у фонд ЮНРРА складаў 1-2 % нацыянальнага даходу краін - членаў арганізацыі. СССР быў вызвалены ад уплаты ўзносаў. У жніўні 1945 г. у члены ЮНРРА былі прыняты Беларусь і Украіна, якія з'яўляліся членамі ААН. У верасні 1945 г. дзвюм рэспублікам была выдзелена дапамога ў памеры: БССР - 61 млн дол., УССР - 189 млн. Гэтыя рэспублікі разам з васьмю іншымі еўрапейскімі краінамі адносіліся да групы А, якім аказвалася дапамога ў першую чаргу і ў памеры больш чым адзін долар на душу насельніцтва. Самую вялікую дапамогу атрымала Грэцыя - 46,7 дол. на чалавека. БССР - 5,8 дол. на душу насельніцтва, УССР - 5,2 дол. І хаця гэта і былі найменшыя паказчыкі з усіх краін-донараў, акрамя Албаніі, дапамога, якая паступала ў Беларусь у 1946-1947 гг., дала магчымасць выжыць многім людзям у цяжкія пасляваенныя гады[18].

Харчовыя тавары складалі амаль палову дапамогі ААН-ЮНРРА ў вартасным выражэнні (каля 30 млн дол.) і 71 % па вазе. За выключэннем хлеба, збожжа і бульбы, харчаванне, якое атрымала БССР па лініі ЮНРРА, складала больш за 90 % усіх харчовых тавараў у крамах рэспублікі (сродкі ад іх продажу ішлі на аднаўленне). Паступала мяса, малочныя прадукты, тлушчы, алей, якія амаль поўнасцю, як сцвярджае У. Снапкоўскі, адсутнічалі на ўнутраным рынку. Таксама ў значных памерах пастаўляліся збожжавыя, бабовыя культуры, рыба і рыбапрадукты, сокі, джэмы. Істотная частка харчовых прадуктаў раздавалася дзіцячым дамам, бальніцам, найбольш пацярпелым грамадзянам[19].

Другой па значнасці групай паставак ЮНРРА (каля 18 млн дол.) было абсталяванне і тавары для прамысловага аднаўлення: электрастанцыі з Англіі, амерыканскія грузавікі, трактары і бульдозеры; французскія і англійскія будаўнічыя краны і г. д.[20]

Дапамога па аднаўленню сельскай гаспадаркі (5,4 млн дол.) уключала 5300 т насеннага зерня, насенне агародніны, канюшыны, вікі і іншых травяных культур. Да веснавой сяўбы 1947 г. Беларусь атрымала па лініі ЮНРРА 653 колавых і 130 гусенічных трактароў[21].

Больш чым на сем мільёнаў долараў было пастаўлена вопраткі і абутку, на адзін мільён - медыцынскага абсталявання і лекаў, у тым ліку абсталяванне пеніцылінавага завода, электракардыёграфы, рэнтгенаўскія апараты і інш. Усё мыла паступала ў Беларусь па лініі ЮНРРА[22].

Дапамога, якая паступала ў 1946-1947 гг. у Беларусь па лініі ЮНРРА, нягледзячы на абмежаваны, недастатковы аб'ём, адыграла важную ролю ў забеспячэнні першапачатковых патрэб насельніцтва, у пераадоленні пасляваеннай разрухі ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, спрыяла наладжванню дружалюбных адносін беларускага народа з народамі іншых краін, была ўвасабленнем салідарнасці і падтрымкі Беларусі з боку міжнароднай супольнасці.

Такім чынам, новыя даследаванні па праблемах пасляваеннага аднаўлення гаспадаркі Беларусі, наладжванні мірнага жыцця дазваляюць больш грунтоўна, аб'ектыўна і ўсебакова асэнсаваць крыніцы тых вялікіх дасягненняў, якіх дабіўся беларускі народ пасля самай разбуральнай у сваёй гісторыі вайны. і ў гэтым працэсе наладжвання жыцця мірнага насельніцтва разам з вызначальнай роллю ўнутраных крыніц - саюзных капіталаўкладанняў, працоўнага гераізму беларускага народа, дапамогі рэспублік СССР - мелі значэнне справядліва спагнаныя з агрэсара германскія рэпарацыі ў форме матэрыяльных паставак, працы ваеннапалонных і інтэрніраваных, а таксама дапамога сусветнай супольнасці па лініі ААН-ЮНРРА. У перыяд пасляваеннага аднаўлення закладваўся фундамент эканомікі Беларусі як адкрытай - арыентаванай на спажыванне значнай долі рэсурсаў з-за межаў рэспублікі і вываз значнай долі прадукцыі ў іншыя рэспублікі і краіны свету.

1 Гл.: Народное хозяйство Белорусской ССР: Стат. сб. М., 1957. С. 14.
2 Гл.: Купреева А.П. Народы СССР - трудящимся Белоруссии. Мн., 1981. С. 176-180.
3 Гл.: Экономика Белоруссии в период послевоенного возрождения. Мн., 1988. С. 36-37.

5 Гл.: Снапкоўскі У. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі, 1944-1953 гг. Мн., 1997; **ЁН** жа . Рэпарацыі // Энцыкпапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Мн., 2001. Т. 6. Ч. 1. С. 172-173.

7 Гл.: Бушчык Г.П. Роль германских репараций в формировании современного промышленного облика Минска // Устойчивое развитие современных крупных городов: теория, опыт, проблемы. Материалы Междунар. науч.-практ. конф. Мн., 2002. С. 262-267; Яна ж. Значэнне германскіх рэпарацый для аднаўлення гаспадаркі г. Магілёва і Магілёўскай вобласці пасля другой сусветнай вайны // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць: 36. навук. прац удзельнікаў III Міжнар. навук. канф.: У 2 ч. Магілёў, 2003. Ч. 2. С. 119-127; Яна ж. Германскія рэпарацыі і іх роля ў аднаўленні і развіцці эканомікі Беларусі пасля другой сусветнай вайны // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы Міжнар. навук. канф. Мн., 2003. С. 47-51.

9 Гл.: Евгеньев В.В. Международно-правовое регулирование репараций после второй мировой войны. М., 1950. С. 65, 66, 74, 84.
10 Гл.: Снапкоўскі У. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі, 1944-1953 гг. С. 108.
11 Гл.: Евгеньев В. В. Указ. сач. С. 83.
12 История СССР. Эпоха социализма (1917-1957 гг.). М., 1958. С. 636.
13 Гл.: Бушчык Г.П. Германскія рэпарацыі і іх роля ў аднаўленні і развіцці эканомікі Беларусі пасля другой сусветнай вайны // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: Матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 16 мая 2003 г. Мн., 2003. С. 48, 49.
14 Гл.: НА РБ. Ф. 93. Воп. 9. Спр. 1037. Л. 219, 276; Там жа. Спр. 1040. Л. 98.
15 Гл.: Экономика Белоруссии в период послевоенного возрождения. С.152.
16 Гл.: Шарков А.В. Архипелаг ГУПВИ на территории Беларуси: 1944-1951 гг. С. 40.
17 Гл.: Там жа. С. 74-75, 93.
18 Гл.: Снапкоўскі У. Указ. сач. С. 59, 61, 68.
19 Гл.: Там жа. С. 69.
20 Гл.: Там жа. С. 68, 69.
21 Гл.: Там жа. С. 70.
22 Там жа. С. 72.

Паступіў у рэдакцыю 17.05.05.

***Галіна Пятроўна Бушчык*** - кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дактарант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Навуковы кансультант - доктар гістарычных навук, прафесар П.І. Брыгадзін.